**А.А.Корбут,**
*дацэнт*

# САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ПЕДАГОГА Ў МІКРАСОЦЫУМЕ

Сацыяльная педагогіка ў нашай краіне да нядаўняга часу не разглядалася як самастойная галіна педагагічных ведаў. Укараненне яе як прафесіі толькі пачынаецца, і гэты працэс быў паскораны ў сувязі з увядзеннем спецыяльнасці "сацыяльны педагог". У той жа час аб'ектыўная неабходнасць даўно патрабавала шырокіх навуковых даследаванняў у сферы сацыяльнай педагогікі, адсутнасць якіх не толькі стрымлівала развіццё педагогікі наогул, але і перашкаджала мэтанакіраванаму ажыццяўленню працэсу сацыяльнага выхавання ў рэспубліцы.

Сацыяльная педагогіка арганізуе сваю дзейнасць, зыходзячы са зместу рэальнага соцыуму. Ён жа сёння адчувае крызісныя з'явы рознага характару, у тым ліку экалагічную, сыравінную, дэмаграфічную нестабільнасць. У рэспубліцы ўсё гэта ўзмацнілася негатыўнымі працэсамі ў эканоміцы, палітыцы, культуры і іншых сферах грамадскага жыцця. Яны прывялі да крызісу ў адукацыі і выхаванні, сталі першапрычынамі нарастання негатыўных з'яў у сям'і, паводзінах моладзі, змянення яе каштоўнасных арыентацый, спосабу жыцця.

Новае, дэмакратычнае, гуманнае грамадства ўсвядоміла патрэбу ў пошуку новай адукацыйна-выхаваўчай парадыгмы, якая заснавана перш за ўсё на развіцці сутнасных сіл чалавека, адраджэнні асобаснага пачатку ва ўсіх сферах яго жыццядзейнасці. Яно таксама накіравана на пошук эфектыўных спосабаў аховы чалавека, яго праў і інтарэсаў ад сацыяльных і прыродных катаклізмаў, на стварэнне новых адукацыйна-выхаваўчых сістэм, якія садзейнічаюць сацыялізацыі асобы, яе ўключанасці ў сацыяльную практыку ў якасці не толькі прадукцыйнай сілы, але і паўнапраўнага суб'екта грамадскіх зносін.

У Рэспубліцы Беларусь і раней рабіліся намаганні па стварэнні сістэмы сацыяльнага выхавання чалавека, аказанні яму сацыяльнай падтрымкі, дапамогі і рэабілітацыі. Аднак гэта работа была малаэфектыўнай у сувязі з міжведамаснай раз'яднанасцю, не мела стройнай сістэмы. Да дзейнасці ў ёй прыцягваліся асобы, якія не мелі спецыяльнай прафесійнай падрыхтоўкі. Безумоўна, вынік іх работы высокім быць не мог.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Замежная практыка даўно мае вопыт падрыхтоўкі такіх спецыялістаў. Нельга сказаць, што ў нас у гэтай галіне нічога не рабілася. Менавіта практыку сацыяльна-педагагічнай дзейнасці здзяйснялі арганізатары пазакласнай і пазашкольнай работы, якія існавалі ў штатным раскладзе школ у 70—80-я гады, педагогі-арганізатары работы з дзецьмі па месцы жыхарства, старшыя піянерскія важатыя, інспектары па справах непаўналетніх, арганізатары летняга адпачынку школьнікаў і інш. Аднак іх дзейнасці ў большай ступені быў уласцівы арганізацыйны кампанент, чым накіраванасць на развіццё асобаснай індывідуальнасці дзіцяці, аказання яму канкрэтнай дапамогі ў сацыялізацыі і рэсацыялізацыі. І спецыфіку прафесійнай дзейнасці яны асвойвалі часцей метадам спроб і памылак на практыцы, а не шляхам кваліфікаванай падрыхтоўкі ў вучэбных установах.

Сёння сітуацыя рэзка змянілася. Больш за сем гадоў у рэспубліцы афіцыйна дзейнічае інстытут сацыяльных педагогаў, якія закліканы забяспечыць на асобасным узроўні канкрэтную дапамогу індывіду ў яго сацыялізацыі і рэсацыялізацыі. Гэта, безумоўна, вялікае дасягненне педагогікі. Думаем, няма неабходнасці даказваць, што фарміраванне асобы — выключна складаны працэс, на які аказвае ўплыў шмат фактараў, як прыродных, так і сацыяльных. На жаль, даводзіцца канстатаваць, што ў педагагічнай навуцы і практыцы выхавання ім не ўдзялялася належнай увагі. Гэта і пазбаўляла іх рэальнага жыццёвага зместу. Але толькі пры апоры на знешнія і ўнутраныя фактары развіцця асобы адбываецца фізічнае і псіхічнае станаўленне чалавека. Пры ўзаемадзеянні з прыродай, прадметным і духоўным асяроддзем засвойваюцца сацыяльны вопыт, грамадскія нормы і каштоўнасці і, як вынік, адбываецца самарэалізацыя чалавека ў ім як асобы.

Разам з тым дэфармацыя грамадскіх структур, сацыяльная напружанасць выклікалі асобую патрэбу ў абароне сям'і, дзяцінства, асобы ад непажаданых фактараў сацыялізацыі. Асюль і задачы сацыяльнай педагогікі складаюцца з таго, каб, з аднаго боку, навакольнае асяроддзе зрабіць па-сапраўднаму выхаваўчым, а, з другога, абараніць ад яго неспрыяльнага ўздзеяння маленькага чалавека. Дзеля гэтага неабходны прафесійны педагог-выхавацель, інакш кажучы, сацыяльны педагог.

Дакладнага вызначэння прафесійнай сутнасці дадзенай педагагічнай спецыяльнасці пакуль не існуе. Ёсць розныя падыходы да яе зместу. Калі прааналізаваць замежныя даследаванні, то

можна адзначыць, што і там існуюць розныя пункты гледжання на гэтую праблему. Так, у ФРГ сацыяльнага педагога разглядаюць як "спецыяліста ў галіне сацыяльнай работы або выхаваўчай дзейнасці". Амерыканскія педагогі бачаць яе сутнасць "у аказанні дапамогі індывідам, групам, суполкам у мэтах паляпшэння ці аднаўлення іх здольнасці да сацыяльнага функцыяніравання, стварэння спрыяльных умоў для дасягнення гэтых мэт у соцыуме". У Англіі асноўным тэзісам гэтай дзейнасці з'яўляюцца "вызваленне і развіццё рэсурсаў чалавека і яго сацыяльнага асяроддзя".

Можна таксама адзначыць, што за мяжой сацыяльна-педагагічная практыка прадугледжвае работу ў адкрытым соцыуме, і тут не існуе дакладнай розніцы паміж спецыфікай дзейнасці сацыяльнага педагога і сацыяльнага работніка, паколькі тыя і іншыя лічаць галіной сваёй дзейнасці "асобу ў асяроддзі" і "асобу ў сітуацыі".

Тэрміналагічная недакладнасць адносна дадзенага паняцця існуе і ў нас. Як від прафесійнай дзейнасці гэта прафесія была прызнана агульнасаюзнымі дакументамі ў 1989 г. Яе ўвядзенне было дэтэрмінавана пошукам вырашэння перш за ўсё праблем ва ўзаемаадносінах "асоба — сям'я — грамадства" (В.Г.Бачарова), дзе сям'я стала разглядацца не як дапаможны інстытут выхавання, а як галоўная ўмова і сродак станаўлення асобы. Сацыяльны педагог павінен быў дапамагчы сям'і і іншым выхаваўчым інстытутам выконваць ролю пасрэдніка, сувязнога звяна паміж дзецьмі і дарослымі ў працэсе выхавання і сацыялізацыі.

Зараз дзейнасць сацыяльнага педагога паглыбляецца і дыферэнцыруецца ў сувязі са спецыялізацыяй, аднак абвостраныя супярэчнасці паміж самім жыццём і ўзроўнем падрыхтаванасці моладзі да ўдзелу ў стварэнні новага грамадства, паміж вялізнымі патэнцыямі сутнасных сіл чалавека і сацыяльнымі ўмовамі іх развіцця і рэалізацыі, паміж дзейнаснай прыродай самога чалавека і недахопам у яго сацыяльнага вопыту, ведаў, уменняў для яе праяўлення патрабуюць новых падыходаў і да выхавання як сацыяльнай з'явы. Выхаванне як частка рэгуляванай сацыялізацыі мае пэўныя магчымасці па аказанні ўздзеяння на сацыяльную прастору, у якой фарміруецца асоба. Яно можа кампенсаваць недахопы асяроддзя, здзяйсняць педагагічны кантроль за працэсам сацыялізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Таму на першым плане ў сацыяльнага педагога любой спецыялізацыі стаяць перш за ўсё праблемы, якія звязаны са стварэннем умоў для выхавання і сацыялізацыі асобы, пераўтварэннем і выкарыстаннем у гэтых мэтах навакольнага соцыуму, магчымасцей грамадскіх інстытутаў, а таксама аказанне індывідуальнай сацыяльна-тэрапеўтычнай дапамогі і падтрымкі чалавеку.

Сацыяльна-педагагічнай навуцы і практыцы ў рэспубліцы прыходзіцца вырашаць і яшчэ адну важную праблему — гэта сацыяльна-педагагічная дапамога дзецям і іх сем'ям, пацярпеўшым ад чарнобыльскай трагедыі. Аспектаў яе мноства. Гэта і практыка выхавання дзяцей, непасрэдна пацярпелых ад катастрофы, і праблемы дзяцей-перасяленцаў, іх адаптацыі да новага гарадскога ці сельскага соцыуму, і сацыяльная дапамога тым, хто ў выніку аварыі мае адхіленні ў стане здароўя і хто яшчэ знаходзіцца ў небяспечнай зоне, і многія іншыя, якія з'яўляюцца штодзённа.

Такім чынам, у сферу дзейнасці сацыяльнага педагога ўваходзяць сям'я, падлеткавы клуб, маладзёжнае аб'яднанне, мікрараён школы, месца жыхарства дзіцяці, культурна-аздараўленчыя і адпачынкавыя цэнтры, пазашкольныя ўстановы, апякунскія саветы, медыцынскія паліклінікі, цэнтры занятасці моладзі і інш. Словам, усё тое, што акружае асобу, уплывае на яе станаўленне, ад чаго залежыць яе самаадчуванне ў грамадстве.

Зразумела, дзейнасць падобнага роду патрабуе асаблівай духоўна-практычнай накіраванасці, паколькі звязана перш за ўсё з вырашэннем асобасных праблем дзіцяці. Без любві і павагі да чалавека, спагады да яго праблем немагчыма стаць даверанай асобай юнаму чалавеку, які патрабуе дапамогі, падтрымкі і абароны. Каб вырашыць гэтыя праблемы, неабходна мець сістэму навуковых ведаў аб сацыяльнай педагогіцы, спецыфіцы і заканамернасцях сацыяльнага выхавання, сродках, метадах, тэхналогіях аказання сацыяльна-педагагічнай дапамогі на аснове інтэграцыйных ведаў пра чалавека, яго фізіялогію, псіхіку, асаблівасці развіцця. Гэтыя веды ў айчыннай сацыяльна-педагагічнай навуцы толькі складваюцца, пры гэтым выкарыстоўваецца замежны вопыт тэорыі і практыкі сацыяльнай педагогікі і сацыяльнай работы.

Сацыяльная педагогіка ў нашай краіне развіваецца хуткімі тэмпамі і ўключае псіхолага-педагагічную, прававую, эканамічную абарону сям'і, дзяцінства; карэкцыю развіцця і



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паводзін дзяцей, падлеткаў, юнацтва; культурна-адпачынкавую работу ў мікрасоцыуме. Новая прафесія мае патрэбу ў навукова-педагагічным абгрунтаванні, распрацоўцы ўмоў, шляхоў і сродкаў павышэння выхаваўчай дзейнасці, вызначэнні неабходных стандартаў. Прыярытэты ў пытаннях выхавання пераносяцца ў галіну педагогікі адносін, сацыяльнай педагогікі, фарміравання педагагічна арыентаванай інфраструктуры мікрасоцыуму, паўнацэннага выкарыстання спецыфічных магчымасцей сям'і і грамадства, культурнага, інтэлектуальнага, прафесійнага, ідэалагічнага патэнцыялу і мікрасацыяльнага наваколля.

Такім чынам, наспела неабходнасць распрацоўкі якасна новых, у шэрагу выпадкаў альтэрнатыўных падыходаў да сацыякультурных працэсаў; выпрацоўкі адэкватных, сацыяльна абумоўленых параметраў ацэнкі і прагнозу ідэалогіі і паводзінскай структуры асобных груп моладзі, магчымасцей іх адаптацыі, што прадвызначае накіраванасць сістэмы выхавання дзяцей, падлеткаў на іх падрыхтоўку да прынцыпова новага ўзроўню развіцця грамадства, культуры, цывілізацыі.

**Н.Я.Петушко,**
*аспірантка*

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ КРАЯЗНАЎЧАЙ І ТЫФЛАКРАЯЗНАЎЧАЙ РАБОТЫ БІБЛІЯТЭК ДЛЯ НЕВІДУШЧЫХ ПА АДРАДЖЭННІ ДУХОЎНЫХ ТРАДЫЦЫЙ

Сучаснае адраджэнне бібліятэчнага краязнаўства выклікана перш за ўсё небывалым уздымам нацыянальнай самас-вядомасці, прызнаннем прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей. Яно дапамагае запоўніць у грамадскай свядомасці той духоўны вакуум, аб якім сёння шмат кажуць, бо духоўнасць прывіваецца разам з любоўю да Бацькаўшчыны, дапамагае сфарміраваць пачуццё грамадзянскасці ў чытачоў. Гэта і ёсць мэта бібліятэчнай краязнаўчай і тыфлакраязнаўчай работы. Яна ўключае ў сябе выяўленне, камплектаванне, улік і распаўсюджванне інфармацыі і матэрыялаў аб родным краі, аб жыцці і дзейнасці вядомых людзей — ураджэнцаў дадзенай тэрыторыі, творах мясцовых



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ